Бурачонак, А. В. Прававое рэгуляванне сацыяльнапрацоўных адносін на фабрычназаводскіх прадпрыемствах Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. / А. В. Бурачонак // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. Вып. 7 / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2012. — С. 80-89.

**А. В. БУРАЧОНАК**

# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ САЦЫЯЛЬНА-ПРАЦОЎНЫХ АДНОСІН НА ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX — ПАЧАТКУ XX ст.

У другой палове XIX — пачатку XX ст. у сферу прадпрымальніцтва пачалі ўсё больш актыўна ўключацца самыя разнародныя сацыяльныя, нацыянальныя, канфесійныя групы насельніцтва, кожная з якіх прыўносіла свой спецыфічны вопыт і тым самым аказвала вялікі ўплыў на фарміраванне новага дзелавога асяроддзя. Саслоўі страчвалі свае спецыфічныя прывілеі, збліжаліся адно з другім у прававым становішчы і паступова трансфармаваліся ў новыя катэгорыі насельніцтва. Яркім прыкладам дадзенай з’явы стала фарміраванне слоя прамысловых прадпрымальнікаў, якія ў парэформенны перыяд актыўна асвойвалі фабрычна-заводскую сферу вытворчасці. Развіццё апошняй запатрабавала ад уладаў мадэрнізацыі існуючага заканадаўства, асабліва ў сферы рэгулявання ўзаемаадносін фабрыкантаў і працоўных, змены ў якой наспявалі яшчэ з дарэформеннага перыяду.

Прававое рэгуляванне сацыяльна-працоўных адносін на фабрычна-заводскіх прадпрыемствах у Беларусі з’яўляецца адной з галоўных інстытуцыянальных умоў развіцця прамысловага прадпрымальніцтва ў парэформенны перыяд. Нягледзечы на гэта, у айчыннай гістарыяграфіі комплекснага даследавання, прысвечанага дадзенай праблеме, не існуе. Пэўныя аспекты адзначанага пытання знайшлі адлюстраванне яшчэ ў працах дарэвалюцыйных даследчыкаў. Сярод іх неабходна вылучыць А. Я. Антановіча [2], У. П. Літвінава-Фалінскага [19], М. І. Туган-Бара-

**Бурачонак Аляксандр Вячаслававіч** — аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

ноўскага [23]. У савецкі час айчынныя гісторыкі, разглядаючы дадзенае пытанне, у большасці сваёй узгадвалі тыя фактары, што замаруджвалі прамысловае развіццё Беларусі, а таксама стараліся надаць негатыўную афарбоўку станоўчым крокам у гэтым накірунку.

Для аб’ектыўнага і ўсебаковага аналізу норм рэгулявання сацыяльна-працоўных адносін на фабрычна-заводскіх прадпрыемствах у парэформенны перыяд неабходна з дастатковай увагай аднесціся да вывучэння крыніц заканадаўчага характару, якія змешчаны ў другім і трэцім выданнях «Поўнага збору законаў Расійскай імперыі». Каб прасачыць, якое значэнне мелі прынятыя законы на практыцы, варта звярнуцца да матэрыялаў справаводства, а менавіта да дакументацыі гаспадарча-эканамічных устаноў, што змешчана ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ). Так, у дакументах фонда 311 «Старэйшы фабрычны інспектар Мінскай губерні» НГАБ утрымліваюцца звесткі аб кантролі за выкананнем нормаў, замацаваных у адпаведных заканадаўчых актах, у тым ліку ў сферы сацыяльна-працоўных адносін. Пэўную інфармацыю аб тым, якое значэнне мела новае заканадаўства для развіцця фабрычна-заводскай вытворчасці [5; 6; 7; 8; 9], можна знайсці ва Усепадданых аглядах губерняў, якія даюць абагульненую тэкставую інфармацыю па розных сферах сацыяльна-эканамічнага жыцця губерняў і падмацоўваюць яе статыстычнымі данымі.

Прабел у нормах рэгулявання ўзаемаадносін фабрыкантаў і працоўных быў часткова запоўнены прыняццем 3 чэрвеня 1886 г. «Правілаў аб наглядзе за ўстановамі фабрычнай прамысловасці і аб узаемных адносінах фабрыкантаў і працоўных» [11], якія ўсталёўвалі парадак найму і звальнення працоўных. Чалавек, які ўладкоўваўся на працу, павінен быў прадаставіць загадчыку фабрыкі ці завода дакумент, што пацвярджаў асобу, з указаннем месца жыхарства (пры яго змене — тэрмінова паведамляць аб гэтым кіраўніцтву). На працягу тыдня пасля ўладкавання працоўны атрымліваў разліковую кніжку, у якой пазначаліся прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада, тэрмін і ўмовы найму працоўнага (на вызначаны тэрмін, на нявызначаны тэрмін або на час выканання нейкай працы); у гэтую кніжку рабіўся запіс аб заробку. Пры найме на нявызначаны тэрмін кожны з бакоў павінен быў за два тыдні паведаміць аб сваім намеры скасаваць дагавор. Гаспадар прамысловага прадпрыемства не мог змяншаць памер заробку, аб якім папярэдне дамовіліся бакі, ці плаціць яго ў выглядзе прадуктаў харчавання, прамысловых вырабаў і іншых прадметаў (за выключэннем купонаў), а таксама браць з працоўных працэнты за грошы, якія былі ім пазычаны. Забаранялася спага-

няць з працоўных плату за медыцынскую дапамогу, асвятленне майстэрняў і выкарыстанне прыладаў вытворчасці. З працоўных дазвалялася спаганяць штрафы толькі за дрэнную працу, за прагул і парушэнне парадку; растлумачвалася сутнасць гэтых нагод і ўсталёўваліся максімальныя памеры штрафаў, агульная сума якіх не павінна была перавышаць траціны заробку работніка. Са штрафных грошаў складаўся штрафны капітал, які можна было расходаваць толькі на дапамогу працоўным.

Да канца XIX ст. заставалася нявырашаным пытанне наконт працягласці працоўнага дня на фабрыках і заводах, хаця законапраекты па гэтай праблеме пачалі распрацоўвацца яшчэ ў 60-х гг. XIX ст. Фабрычнае заканадаўства ў Расійскай імперыі, падобна да ангельскага і шматлікіх іншых, нармавала працоўны час толькі дзяцей і жанчын. 2 чэрвеня 1897 г. быў прыняты Закон «Аб працягласці і размеркаванні працоўнага часу ва ўстановах фабрычна-заводскай прамысловасці» [9], згодна якому было ўведзена абмежаванне працоўнага часу: 11,5 гадзін удзень і 10 гадзін уначы, у суботу і перад святамі. Ён таксама забараняў працу ў нядзелю і ўсталёўваў 14 абавязковых святаў. Па ўзаемным пагадненні працоўныя маглі працаваць у нядзелю замест будняга дня. Разам з тым зверх усталяванага гэтым Законам працоўнага часу можна было ўводзіць яшчэ і звышвызначаныя працы па асабістай дамове. Галоўнай па фабрычных і горназаводскіх справах Прысутнасці надаваліся правы выдання падрабязных правілаў і інструкцый аб размеркаванні працоўнага часу для асобных галінаў прамысловасці, у тым ліку і ў бок павелічэння дапушчальнай працягласці працоўнага часу. Закон набыў моц з 1 студзеня 1898 г. і быў адразу распаўсюджаны на 60 губерняў Еўрапейскай Расіі, ахапіўшы ўсе прамысловыя ўстановы.

Нягледзячы на набыццё Законам моцы, некаторыя фабрыканты, карыстаючыся адсутнасцю належнага кантролю за яго выкананнем, працоўны дзень на сваіх прадпрыемствах устанаўлівалі звыш нормы. Так, працоўныя на шэрагу гарбарных заводаў у Смаргоні працавалі па 17 гадзін у суткі, качагары пры паравым катле і машыністы пры паравой машыне на фабрыцы шавецкіх калодак у Барысаве працавалі па 13 гадзін, у той час як звычайныя працоўныя на тым жа прадпрыемстве — па 11,5 гадзін [1, с. 118]. Некаторыя прадпрымальнікі, наадварот, скарачалі працоўны дзень на сваіх прадпрыемствах. Яскравым прыкладам гэтага служыць прымяненне на Добрушскай папяровай фабрыцы ўпершыню ў Расійскай імперыі 8-гадзіннага працоўнага дня [18]. На скарочаны працоўны дзень пры трохзменнай працы прадпрыемства перайшло з мая 1894 г., за тры гады да прыняцця вышэйназванага Закона.

Пры гэтым працоўным быў пакінуты заробак, які яны атрымлівалі за 12-гадзінную працу. На іншых прадпрыемствах назіралася нязначнае паніжэнне працоўнага часу. Так, у пачатку XX ст. на Камарскім машынабудаўнічым заводзе Таварыства Якабсон, Ліўшыц і К° праца працягвалася 10 гадзін без уліку перапынкаў на сняданак і абед [25, л. 7], на фанернай фабрыцы «Прыма» Я. І. Лур'е — 10,5 гадзін [24, л. 72], на фабрыцы па вытворчасці шпалераў К. М. Кантаровіча — 9,5 гадзін [21, л. 99], на шкляным заводзе В. Краеўскага — 9 гадзін [22, л. 41].

Адным з першых заканадаўчых актаў, які рэгуляваў працоўныя адносіны ў парэформеннай Расіі, з'яўляўся Закон ад 1 чэрвеня 1882 г. «Аб малалетніх, якія працуюць на заводах, фабрыках і мануфактурах» [5]. Ён уводзіў забарону на працу дзяцей да 12 гадоў, працу ўначы (з 21.00 да 5.00) і ў нядзелю, выкарыстанне дзіцячай працы на шкодных для здароўя вытворчасцях, а таксама абмяжоўваў для малалетніх ва ўзросце 12—15 гадоў працу 8 гадзінамі ўдзень (пры гэтым не больш 4 гадзін без перапынку). Уласнікі прадпрыемстваў павінны былі даваць магчымасць дзецям, якія не скончылі курс у ніжэйшых народных школах, наведваць іх не менш 12 гадзін у тыдзень. Закон быў уведзены ў дзеянне з 1 мая 1884 г., пры гэтым яшчэ два гады па дазволе міністра фінансаў дапускалася праца дзяцей 10—12 гадоў і начная праца (не больш 4 гадзін) малалетніх ва ўзросце 12—15 гадоў. Дзеля кантролю за гэтым 5 чэрвеня 1884 г. быў прыняты Закон «Аб спагнаннях за парушэнне пастановаў аб працы малалетніх на заводах, фабрыках і мануфактурах» [3]. Наступным крокам да абмяжавання дзіцячай працы стаў Закон ад 3 чэрвеня 1885 г. «Аб забароне начной працы непаўналетніх і жанчын на заводах, фабрыках і мануфактурах» [4], які набыў моц 1 кастрычніка 1885 г. Паводле яго забаранялася начная праца (з 21.00 да 5.00) жанчын і падлеткаў да 17 гадоў на баваўняных, палатняных і ваўняных фабрыках. Існуе меркаванне, што прадпрымальнікі падтрымалі гэтыя заканадаўчыя рашэнні па прычыне эканамічнага застою, які панаваў у гэты час у Расійскай імперыі.

Дзеянне законаў па абмежаванні жаночай і дзіцячай працы не было працяглым. 24 красавіка 1890 г. быў прыняты Закон «Аб змяненні пастаноў аб працы малалетніх, падлеткаў і асоб жаночага полу на фабрыках, заводах і мануфактурах і аб распаўсюджванні правілаў аб працы і навучанні малалетніх на рамесныя ўстановы» [10], згодна якому малалетніх маглі прыцягваць да працы 6 гадзін у дзень без перапынку ці 9 гадзін у дзве змены. У шкляной вытворчасці дазвалялася нават ставіць падлеткаў на 6 гадзін начной працы. Заканадаўча вызначаны начны час быў скарочаны з 22.00 да 4.00. Галоўным прызначэннем Закона лічылася тое, што

ён замацаваў, з улікам назапашанага досведу, шэраг палажэнняў, пазначаных Законамі ад 01.06.1882 і 03.06.1885 як часовыя. Таму адмысловыя тэрміны ўступлення закона ў дзеянне не вызначаліся — ён толькі карэктаваў ужо прынятую практыку.

Па меры развіцця прававога рэгулявання ў сферы сацыяльна-працоўных адносін урад Расійскай імперыі не мог абысці такі момант, як страхаванне працоўных. 2 чэрвеня 1903 г. былі прыняты «Правілы аб узнагароджанні пацярпелых у выніку няшчасных выпадкаў працоўных і служачых, а таксама членаў іх сямействаў у прадпрыемствах фабрычна-заводскай, горнай і горназаводскай прамысловасці» [13]. Гэтымі Правіламі ўсталёўвалася адказнасць прадпрымальнікаў за няшчасныя выпадкі, якія здарыліся падчас працы (акрамя выпадкаў, калі было даказана, што прычынай няшчаснага выпадку былі «злы намер» або «грубая неасцярожнасць» пацярпелага). Лячэнне цалкам аплачвалася кіраўніцтвам прадпрыемства. Пацярпелым павінна было выплачвацца грашовае «ўзнагароджанне», памер якога залежаў ад ступені атрыманых траўмаў. Пры часовай страце працаздольнасці выплачвалася дапамога, якая складала палову заробку, з дня няшчаснага выпадку да дня аднаўлення працаздольнасці, у выпадку пастаяннай страты працаздольнасці — пажыццёвая пенсія ў памеры 2/3 заробку. У тым выпадку, калі працоўны ў выніку няшчаснага выпадку загінуў, кіраўніцтва прадпрыемства было абавязана выплачваць дапамогу на пахаванне і пенсію членам сям'і (сумарна не больш 2/3 заробку): бацькам — пажыццёва, удаве — да ўваходжання ў шлюб, дзецям — да дасягнення 15-гадовага ўзросту. Была прадугледжана магчымасць замены пенсіі па ўзаемным пагадненні на выплату аднаразовай дапамогі, разлічанай ад 10-гадовага памеру пенсіі. Закон набыў моц з 1 студзеня 1904 г.

Наступным крокам развіцця заканадаўства ў сферы страхавання працоўных стала выданне 23 чэрвеня 1912 г. Законаў «Аб заснаванні прысутнасцяў па справах страхавання працоўных» [16], «Аб заснаванні Савета па справах страхавання працоўных» [17], «Аб забеспячэнні працоўных на выпадак хваробы» [15], «Аб страхаванні працоўных ад няшчасных выпадкаў» [14]. Гэтым комплексам заканадаўчых актаў быў заменены Закон ад 2 чэрвеня 1903 г. Пры ўсіх прадпрыемствах адкрываліся бальнічныя касы, у якія павінны былі ўступаць усе працоўныя і служачыя. Удзельнікі кас страхаваліся па новым Законе не толькі ад няшчаснага выпадку, але і ад хваробы. Уласнік прадпрыемства павінен быў забяспечыць першую ўрачэбную дапамогу, а таксама аплаціць бальнічнае лячэнне і набыццё ўсіх медыкаментаў да выздараўлення, але не больш 4 месяцаў. Пры гэтым

хворым давалася грашовая дапамога (ад 1/2 да 2/3 заробку для тых, хто меў утрыманцаў, ад 1/4 да 1/2 заробку — астатнім) з чацвёртага дня хваробы да выздараўлення, але не даўжэй 26 тыдняў падчас адной хваробы. У выпадку родаў выдавалася дапамога не менш за 1/2 заробку за два тыдні да родаў і чатырох тыдняў пасля іх, але толькі тым удзельніцам касы, якія знаходзіліся ў ёй не менш 3 месяцаў да родаў. Калі з работнікам прадпрыемства здараўся няшчасны выпадак, то ён, пры ўмове ўдзелу ў бальнічнай касе, атрымліваў дапамогу. Парадак атрымання дапамогі быў наступным: першыя 13 тыдняў ён атрымліваў грошы з бальнічнай касы, затым — са страхавога капіталу ў памеры 2/3 заробку да аднаўлення працаздольнасці ці да прызначэння пенсіі. Сродкі бальнічных кас фарміраваліся з абавязковых унёскаў працоўных (1—3 % ад заробку), а таксама з грошаў, якія ўносіў гаспадар прадпрыемства.

Кантроль за ажыццяўленнем прынятых законаў быў ускладзены на фабрычную інспекцыю. Дадзены дзяржаўны орган быў заснаваны паводле Закона ад 1 чэрвеня 1882 г. [5] у выглядзе спецыяльнай камісіі, функцыі якой абмяжоўваліся наглядам за працай і навучаннем малалетніх на фабрыках і заводах. Паступова задачы фабрычнай інспекцыі пашыраліся. Згодна заканадаўчаму акту ад 3 чэрвеня 1886 г. [11] у яе абавязкі ўваходзіла: назіраць за выкананнем усіх правілаў, якія рэгулявалі працоўныя адносіны; распараджацца аб прывядзенні ў дзеянне фабрыкамі і заводамі пастаноў губернскіх фабрычных прысутнасцяў; разглядаць і зацвярджаць таксы, табелі, расклады і правілы ўнутранага распарадку, якія складаліся фабрычным кіраўніцтвам для працоўных; прымаць меры да папярэджання сутычак паміж фабрыкантамі і працоўнымі. Закон «Аб фабрычнай інспекцыі» ўводзіўся ў дзеянне паступова, па меры распаўсюджвання органаў кантролю на тэрыторыі розных губерняў. Фактычна да канца XIX ст. усе беларускія губерні былі аб’яднаны ў Віленскую фабрычную акругу. Згодна Закону ад 14 сакавіка 1894 г. «Аб пераўтварэнні фабрычнай інспекцыі і пасад губернскіх механікаў і аб распаўсюджванні дзеяння правілаў аб наглядзе за ўстановамі фабрычна-заводскай прамысловасці і аб узаемаадносінах фабрыкантаў і працоўных» была ўведзена пасада старэйшага фабрычнага інспектара. Гродзенская губерня стала першай беларускай губерняй, на якую распаўсюдзілася дзеянне новага Закона (1894 г.), з 1 студзеня 1897 г. — пасада старэйшага фабрычнага інспектара была створана ў Віленскай і Віцебскай губернях [7], з 1 ліпеня 1897 г. — у Магілёўскай і Мінскай губернях [8].

У 1894 г. былі некалькі зменены паўнамоцтвы фабрычнай інспекцыі. Акрамя асноўных абавязкаў па рэгуляванні працоўных адносін на фаб-

рычных інспектараў былі ўскладзены ўсе абавязкі, якія дагэтуль выконваліся губернскімі механікамі: агляд і апісанне фабрык і заводаў, збор і праверка фабрычна-заводскай статыстыкі, кантроль за паравымі рухавікамі і катламі.

Фабрычнаму заканадаўству Расійскай імперыі быў уласцівы шэраг істотных недахопаў. Па-першае, характэрнай рысай законаў была слабасць кантролю за іх выкананнем, нават пасля стварэння фабрычнай інспекцыі. Яе штаты былі вельмі малымі, а абавязкі — вельмі вялікімі, каб было магчыма кантраляваць выкананне законаў. Гэта прыводзіла да таго, што фабрыканты звярталіся да выкрутаў, каб пазбегнуць нагляду інспекцыі. Пацверджаннем гэтага з'яўляецца інфармацыя, якая змяшчаецца ў справаздачы губернатара Гродзенскай губерні за 1902 г. У ёй адзначаецца, што прадпрымальнікі з ліку яўрэйскага насельніцтва часта намагаюцца пазбегнуць фабрычна-інспектарскага нагляду шляхам штучнага, часам фіктыўнага драблення ўласных прамысловых прадпрыемстваў. І гэта ў іх атрымоўваецца, бо ў некаторых галінах вытворчасці ўлавіць пераход ад установ фабрычна-заводскага да рамеснага тыпу вельмі складана [20, с. 16—23].

Па-другое, у законах утрымлівалася даволі шмат незразумелых, расплывістых фармулёвак, якія дазвалялі фабрыкантам у шэрагу выпадкаў лёгка абысці закон. Прадпрымальнікі таксама нярэдка дамагаліся магчымасці дзеяння закона ў «падрэзаным» выглядзе па рашэнні розных інстанцый у тых выпадках, калі гэта «было неабходным». Адказнасць прадпрымальнікаў за парушэнні законаў была неадпаведнай характару парушэнняў.

Па-трэцяе, амаль усе адзначаныя вышэй законы нават з улікам тэрытарыяльнай абмежаванасці распаўсюджваліся толькі на працоўных прыватных фабрык і заводаў, што сведчыць аб адсутнасці адзінства прававога рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці. Усе казённыя прамысловыя прадпрыемствы знаходзіліся па-за дзеяннем большасці фабрычных законаў, а праца на іх рэгулявалася пастановамі тых ведамстваў, якім яны былі падначалены. У большасці выпадкаў дзяржаўныя ведамствы апярэджвалі фабрычнае заканадаўства. Так, значна апярэдзілі практыку ў прыватнай і акцыянернай прамысловасці «Найвысока зацверджаныя часовыя правілы аб найме працоўных» [12] для выканання казённых, грамадскіх ці дзяржаўных работ, якія былі прыняты яшчэ ў пачатку парэформеннага перыяду, 31 сакавіка 1861 г. Тут прапісвалася, якім павінен быць дагавор найму, уводзіўся парадак разбору канфліктаў (з удзелам паліцыі), дэкларавалася нават, што наймальнік павінен за-

бяспечыць працоўных здаровым харчаваннем і вадой, бальнічным лячэннем пры неабходнасці, а таксама даць магчымасць наведваць лазню раз на тыдзень, нават калі дзеля гэтага яму прыйдзецца пабудаваць лазню за свой кошт.

Аднак фабрычнае заканадаўства праходзіла ў жыццё з вялікімі цяжкасцямі. Своечасовыя і дальнабачныя ідэі аб неабходнасці прыняцця фабрычных законаў сутыкаліся з зацятым супрацівам як прамыслоўцаў, так і прадстаўнікоў урада, і ад праектаў законаў да іх рэалізацыі праходзілі гады. Так, пытанні аб недапушчэнні да працы дзяцей і абмежаванні працоўнага дня непаўналетнім пачалі распрацоўвацца ў канцылярыях розных ведамстваў яшчэ да адмены прыгоннага права, а рэалізаваны былі толькі ў 80-я гг. XIX ст. Часцяком прапанаваныя ў праектах меры да моманту прыняцця закона значна пераглядаліся на карысць прадпрымальнікаў. Таму практыка ўвядзення законаў значна адставала ад патрэбаў працоўных. На шматлікіх прадпрыемствах, асабліва буйных, уласныя правілы значна апярэджвалі фабрычнае заканадаўства.

Прааналізаваўшы шырокае кола крыніц, варта адзначыць, што фабрычнае заканадаўства хоць і было не зусім дасканалым, але ж мела важнае станоўчае значэнне, паколькі дэманстравала рашучасць урада ўмешвацца ў працоўныя адносіны на прыватных фабрыках і заводах і агароджваць працоўных ад самаўпраўнасці гаспадароў прадпрыемстваў. За дастаткова кароткі, у параўнанні з большасцю развітых краін, перыяд у Расійскай імперыі быў прыняты цэлы комплекс заканадаўчых актаў, якія стваралі аснову для ўрэгулявання значнай колькасці розных аспектаў працоўных адносін: працягласці працоўнага дня, умоў працы дзяцей і жанчын, абавязкаў прадпрымальнікаў пры выплаце заробку, вырашэння працоўных спрэчак, сацыяльнага страхавання. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што ўрад дзейнічаў ва ўмовах адсутнасці іншых механізмаў рэгулявання працоўных адносін, а добрай волі гаспадароў прадпрыемстваў было недастаткова для прыняцця ўзгодненых рашэнняў па дадзеным пытанні.

Урад быў вымушаны лавіраваць паміж націскам з боку фабрыкантаў і заводчыкаў, якія не жадалі прымаць мераў па абмежаванні права ўсталёўваць уласны парадак на сваіх прадпрыемствах, і традыцыйнай для расійскай дзяржаўнасці неабходнасцю патэрналістычнай апекі над бяспраўнымі працоўнымі. Нягледзячы на адзначаныя вышэй недахопы, у Расійскай імперыі ўсё ж быў закладзены фундамент для рэгулявання працоўных адносінаў на канкрэтных прадпрыемствах, з дапамогай якога ўрад заахвочваў прадпрымальнікаў да ўвядзення новых нормаў і ўмоў працы і забараняў найбольш адыёзныя формы эксплуатацыі працоўных.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Абезгауз, З. Е.* Рабочий класс Белоруссии в начале XX в. (1900—1913 гг.) / З. Е. Абезгауз. Минск : Наука и техника, 1977.

2. *Антонович, А. Я.* Курс государственного благоустройства (полицейского права): в 2 ч. / А. Я. Антонович. Киев, 1890. Ч. 2.

3. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о взысканиях за нарушение постановлений о работе малолетних на заводах, фабриках, мануфактурах и в ремесленных заведениях, 5 июня 1884 г., № 2287 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1887. Т. 4. С. 342—343.

4. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о воспрещении ночной работы несовершеннолетним и женщинам на фабриках, заводах и мануфактурах, 3 июня 1885 г., № 3013 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1887. Т. 5. С. 261.

5. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о малолетних, работающих на заводах, фабриках и мануфактурах, 1 июня 1882 г., № 931 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1886. Т. 2. С. 265—267.

6. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о преобразовании фабричной инспекции и должностей Губернских Механиков и о распространении действия правил о надзоре за заведениями фабрично-заводской промышленности и о взаимных отношениях фабрикантов и рабочих, 14 марта 1894 г., № 10420 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1898. Т. 14. С. 106—110.

7. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о распространении на некоторые губернии действия Правил о надзоре за заведениями фабрично-заводской промышленности и о взаимных отношениях фабрикантов и рабочих, 6 мая 1896 г., № 12887 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1899. Т. 16. Отд. 1. С. 364.

8. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о распространении на некоторые губернии действия Правил о надзоре за заведениями фабрично-заводской промышленности и о взаимных отношениях фабрикантов и рабочих, а также об издании нового штата фабричной инспекции, 2 июня 1897 г., № 14232 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1900. Т. 17. С. 355—356.

9. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о продолжительности и распределении рабочего времени в заведениях фабрично-заводской промышленности, 2 июня 1897 г., № 14231 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1900. Т. 17. С. 356—357.

10. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета об изменении постановлений о работе малолетних, подростков и лиц женского пола на фабриках, заводах и мануфактурах и о распространении правил о работе и обучении малолетних на ремесленные заведения, 24 апреля 1890 г., № 6742 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1893. Т. 10. С. 309—310.

11. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета по проекту Правил о надзоре за заведениями фабричной промышленности и о взаимных отношениях фабрикантов и рабочих и об увеличении числа чинов фабричной инспекции, 3 июня 1886 г., № 3769 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1888. Т. 6. С. 262—270.

12. Высочайше утвержденные временные правила о найме рабочих, 31 марта 1861 г., № 36793 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2-е: в 55 т. СПб., 1863. Т. 36. Отд. 1. С. 524—531.

13. Высочайше утвержденные правила о вознаграждении потерпевших вследствие несчастных случаев рабочих и служащих, а равно членов их семейств в предприятиях фаб-

рично-заводской, горной и горнозаводской промышленности, 2 июня 1903 г., № 23060 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. СПб., 1905. Т. 23. С. 595—606.

14. Высочайше утвержденный и одобренный Государственным Советом и Государственною Думою Закон «О страховании рабочих от несчастных случаев», 23 июня 1912 г., № 37447 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. П., 1915. Т. 32. С. 868—882.

15. Высочайше утвержденный и одобренный Государственным Советом и Государственною Думою Закон «Об обеспечении рабочих на случай болезни», 23 июня 1912 г., № 37446 // Полн. соб. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. П., 1915. Т. 32. С. 855—868.

16. Высочайше утвержденный и одобренный Государственным Советом и Государственною Думою Закон «Об учреждении присутствий по делам страхования рабочих», 23 июня 1912 г., № 37444 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. П., 1915. Т. 32. С. 847—850.

17. Высочайше утвержденный и одобренный Государственным Советом и Государственною Думою Закон «Об учреждении совета по делам страхования рабочих», 23 июня 1912 г., № 37445 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3-е: в 33 т. П., 1915. Т. 32. С. 850—855.

18. *Киштымов, А. Л.* Добрушская бумажная фабрика: опыт социальной политики директора-распорядителя А. И. Стульгинского (80-е гг. XIX в. — 1915 г.) / А. Л. Киштымов // Предпринимательство в Белоруссии. 2000. № 7 (28). С. 29—31.

19. *Литвинов-Фалинский, В. П.* Фабричное законодательство и фабричная инспекция в России / В. П. Литвинов-Фалинский. 2-е изд. СПб. : Тип. А. С. Суворина, 1904.

20. Обзор Гродненской губернии: [годовой]. 1902. Гродно : Губернская типография, 1903.

21. Обойная фабрика К. М. Конторовича // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Фонд 311. Воп. 1. Спр. 119.

22. Стекольный завод Краевского // НГАБ. Фонд 311. Воп. 1. Спр. 204.

23. *Туган-Барановский, М. И.* Русская фабрика в прошлом и настоящем / М. И. Туган-Барановский. 3-е изд. СПб. : Наша жизнь, 1907. Т. 1: Историческое развитие русской фабрики в XIX веке.

24. Фанерная фабрика «Прима» // НГАБ. Фонд 311. Воп. 1. Спр. 239.

25. Чугунолитейный и механический завод Товарищества Якобсон, Лившиц и К° // НГАБ. Фонд 311. Воп. 1. Спр. 121.

## РЕЗЮМЕ. SUMMARY

В статье на основании законодательных актов Российской империи второй половины XIX — начала XX в. анализируются нормы регулирования социально-рабочих отношений на фабрично-заводских предприятиях Беларуси в пореформенный период. Выявляются основные направления правового регулирования в данной сфере, уточняются особенности практического осуществления законов на территории Беларуси.

In this article the regulation of social and working relationships in factory-production enterprises of Belarus in the reform period, based on the Russian Empire‘s laws of the second half of the XIX — beginning of XX centuries, is examined. The main areas of legal regulation in this sphere are identified, the particular implementation of laws on the territory of Belarus are specified.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 20 чэрвеня 2010 г.